Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар
па навуковай рабоце БДУКМ
__________ В. Р. Языковіч
«___» ___________2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# САЦЫЯЛОГІЯ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, зацверджанага Міністрам адукацыі 15.07.2014, і вучэбных планаў спецыяльнасцей універсітэта

**СКЛАДАЛЬНІК**

*П. Р. Ігнатовіч,* прафесар кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А. У. Марозаў,* загадчык кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар філалагічных навук, прафесар;

*Л. С. Кажухоўская,* прарэктар па міжнароднай навукова-метадычнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 16.05.2018);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 21.06.2018)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: П. Р. Ігнатовіч

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Спецыяліст у любой галіне дзейнасці павінен валодаць не толькі прафесійнымі ведамі і навыкамі, але і добра арыентавацца ў з'явах грамадскага жыцця, у паводзінах людзей. Гэтаму садзейнічае цэлы комплекс гуманітарных і грамадскіх дысцыплін, якія вывучаюцца ў вышэйшай школе. Важнае месца ў гэтым комплексе займае сацыялогія.

Сацыялогія як навука і вучэбная дысцыпліна цесна звязана з іншымі гуманітарнымі навукамі – сацыяльнай філасофіяй, гісторыяй, эканамічнай тэорыяй, псіхалогіяй, антрапалогіяй, прававымі навукамі і інш.

Важнейшымі структурнымі элементамі сацыялогіі з'яўляюцца тэарэтычная і прыкладная сацыялогія, спецыяльныя і галіновыя сацыялагічныя тэорыі, метадалогія і методыка канкрэтных сацыялагічных даследаванняў. Сярод апошніх важнейшае значэнне для ўніверсітэта культуры мае сацыялогія культуры.

Праграма падрыхтавана ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін «Общеобразовательный стандарт», «Высшее образование. Первая ступень. Цикл социально-гуманитарных дисциплин» (зацверджаны і ўведзены ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 14.11.2014 №159) і тыпавой вучэбнай праграмай па абавязковым модулі «Эканоміка» для ўстаноў вышэйшай адукацыі, зацверджанай і ўведзенай у дзеянне 30.06.2014 (рэгістрацыйны № ТД-СТ.021/тып.).

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт *павінен ведаць:*

– спецыфіку сацыягуманітарных ведаў і спосабы працы з імі;
– галоўныя тэарэтычныя і метадалагічныя праблемы сацыялогіі;
– асноўныя катэгорыі і паняцці сацыялогіі;
– асоб, якія ўнеслі ўклад у станаўленне і развіццё сацыялогіі;
– асновы канкрэтных метадаў і працэдур сацыяльнай работы.

*Умець характарызаваць:*

– цэласнасць сацыякультурнага жыцця і яго мнагамернасць;
– узроўні, структуры, падсістэмы і аб'екты грамадства;
– асноўныя сацыякультурныя працэсы і ўзаемадзеянні.

*Умець аналізаваць:*

– ролю сацыякультурных праблем у асабістым жыцці чалавека;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– трансфармацыйныя працэсы пераходу ад аднаго тыпу грамадства да другога, сацыякультурныя рэаліі, актыўныя сацыяльныя праблемы ў Беларусі і іншых краінах;

– магчымасць і абмежаванні канкрэтных метадаў і працэдур сацыялагічных даследаванняў;

– якасць сацыялагічнай інфармацыі.

*Набыць навыкі:*

– выпрацоўкі сацыяльна арыентаваных ацэнак праблем, з якімі сутыкаецца грамадства;

– ацэнкі канкрэтных жыццёвых сітуацый, абгрунтавання свайго варыянта рашэння, праграмавання ўласных дзеянняў;

– самастойнага, аргументаванага і крытычнага абмеркавання сацыякультурнай праблематыкі.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам у выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Сацыялогія» студэнт павінен набыць наступныя кампетэнцыі.

Акадэмічныя кампетэнцыі:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі ў галіне сацыялогіі;

АК-4. Умець працаваць самастойна;

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю);

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці;

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;

САК-4. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;

САК-7. З павагай і беражліва ставіцца да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні;

САК-8. Удасканальваць і развіваць свой інтэлектуальны і агульны ўзровень, дамагацца маральнага і фізічнага ўдасканалення сваёй асобы.

Прафесійныя кампетэнцыі:

ПК-3. Рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры і мастацтваў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-4. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сферы культуры і мастацтваў;

ПК-5. Прагназаваць, планаваць і арганізоўваць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць у сферы культуры і мастацтваў;

ПК-8. Аналізаваць і ацэньваць сабраныя звесткі;

ПК-9. Арганізоўваць сваю працу на навуковай аснове, валодаць камп'ютарнымі метадамі збору, захавання і апрацоўкі інфармацыі ў сферы прафесійнай дзейнасці;

ПК-16. Карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і інавацыямі ў дыдактыцы навучання;

ПК-18. Забяспечваць арганізацыйна-кіраўнічае функцыянаванне ўстаноў, арганізацый і аб'яднанняў сацыякультурнай сферы;

ПК-20. Арганізоўваць фінансава-эканамічнае забеспячэнне праектаў у сферы культуры і мастацтваў.

*Метады (тэхналогіі) навучання*

Пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Сацыялогія» з мэтай дасягнення патрабаванняў да падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў рэкамендуецца выкарыстоўваць шырокі арсенал метадаў, сродкаў і форм, якія б арыентавалі на развіццё ў студэнтаў здольнасцей, фарміраванне сістэмнага мыслення, светапогляднага плюралізму, набыццё вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач. Сярод іх:

– пошукава-эўрыстычны метад;
– тэхналогіі навукова-даследчай дзейнасці;
– тэхналогіі модульнага навучання;
– выкарыстанне камп'ютарных тэхналогій;
– метад дзелавых гульняў, круглых сталоў, дыскусій;
– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў, эсэ, аналізу канкрэтнай сітуацыі;
– правядзенне канкрэтных мікрасацыялагічных даследаванняў.

Вучэбная дысцыпліна «Сацыялогія» вывучаецца ў рамках абавязковага модуля «Эканоміка». Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сацыялогія» прадугледжана ўсяго 34 гадзіны, з іх 18 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 12 гадзін – лекцыі, 6 гадзін – семінары.

Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Уводзіны. Сацыялогія як навука і вучэбная дысцыпліна

Сацыялогія як навука.

Аб’ект сацыялогіі. Грамадства ў цэлым, сацыяльныя супольнасці, сувязі і працэсы, асоба.

Прадмет сацыялогіі. Даследаванне заканамернасцей і тэндэнцый станаўлення, развіцця і функцыянавання сацыяльных супольнасцей, сацыяльных сувязей і працэсаў паміж імі, паміж асобай і супольнасцямі, індывідамі.

Законы і катэгорыі сацыялогіі.

Функцыі сацыялогіі: метадалагічная, тэарэтыка-пазнавальная, апісальная, прагнастычная, агульнакультурная, выхаваўчая, функцыя кіравання.

Сацыялогія ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук: гісторыя, сацыяльная філасофія, сацыяльная псіхалогія. Сацыялогія і іншыя сацыяльныя навукі, вывучаючыя асобныя сферы грамадскага жыцця (эканоміка, паліталогія, культуралогія, сацыяльная антрапалогія і інш.).

Гісторыя развіцця сацыялогіі.

Сацыялогія як навука аб грамадстве. Аб’ектыўныя сацыяльна-гістарычныя і тэарэтычныя перадумовы ўзнікнення сацыялогіі.

Сацыялогія XIX – пачатку XX ст. Станаўленне сацыялогіі як самастойнай навукі ў 40-я гг. XX ст. Пазітывісцкая дактрына А. Конта. Сацыялагічны эвалюцыянізм Г. Спенсера. Сацыялагічныя ідэі К. Маркса і яго роля ў развіцці сацыялогіі. Сацыялагічная канцэпцыя Э. Дзюркгейма. «Понимающая» сацыялогія М. Вебера. Класічны этап развіцця сацыялогіі: асноўныя канцэпцыі і падыходы.

Інстытуцыялізацыя сусветнай сацыялогіі. Пачатак дзейнасці сацыялагічных інстытутаў, стварэнне міжнародных сацыялагічных арганізацый, заснаванне спецыяльных журналаў, станаўленне форм.

Руская і савецкая сацыялогія. Асаблівасці фарміравання і развіцця сацыялогіі ў Расіі. Асноўныя плыні ў рускай сацыялогіі XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыялогія ў СССР. Дыскусіі 20-х гг. сярод прадстаўнікоў грамадскай думкі. Асноўныя напрамкі сацыялагічнай работы. Першыя крокі ў галіне сацыялагічнай адукацыі ў новых умовах. Стварэнне праграм, вучэбнай літаратуры, станаўленне структуры сацыялагічнай адукацыі.

Адмоўнае ўздзеянне на сацыялагічную навуку адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Затуханне работы ў галіне навуковай сацыялогіі ў сярэдзіне 30-х гг.

Развіццё сацыялогіі ў Беларусі.

Узнікненне сацыялогіі як самастойнай навукі ў Беларусі (20-я гг. XX ст.). Перыядызацыя развіцця сацыялогіі ў Беларусі. 20-я – пачатак 30-х гг.

Стан сацыялогіі з сярэдзіны 30-х да канца 50-х гг.

Пачатак новага этапу ў развіцці сацыялогіі ў канцы 50-х – пачатку 60-х гг. Арганізацыя аддзела сацыялогіі з трыма сектарамі ў Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі, сацыялагічных лабараторый у Беларускім дзяржаўным універсітэце і Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі. Дзейнасць гаспадарча-дагаворных груп у ВНУ рэспублікі. Станаўленне, развіццё і функцыянаванне сацыялагічных службаў на прадпрыемствах.

Развіццё сацыялагічнай адукацыі (адкрыццё аддзялення сацыялогіі ў БДУ, кафедраў сацыялагічнага кірунку ў ВНУ). Стварэнне самастойнага Інстытута сацыялогіі АН Беларусі (1990) і спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Тэарэтычная і практычная дзейнасць беларускіх сацыёлагаў.

90-я гг. – новы этап у развіцці сацыялогіі ў краіне.

Асноўныя напрамкі сацыялагічных даследаванняў на сучасным этапе.

## Тэма 2. Сістэмныя характарыстыкі грамадства як формы арганізацыі сацыяльных адносін

Шматграннасць паняцця «грамадства». Сістэмны падыход да аналізу грамадства. Грамадства як сфарміраваная ў працэсе гістарычнага развіцця чалавецтва, адносна ўстойлівая сістэма сувязей і адносін людзей, падтрымліваемая звычаямі, традыцыямі і законамі, заснаванымі на пэўным спосабе вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання матэрыяльных і культурных даброт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адметныя рысы грамадства: сацыяльнасць, пастаянная тэрыторыя, наяўнасць сацыяльных інстытутаў, самапазнанне і самарэгуляцыя сацыяльных працэсаў, сацыяльная структура, палітычная незалежнасць, уласныя назва і гісторыя, агульная сістэма каштоўнасцей (звычаі, традыцыі, нормы, законы, правілы, норавы).

Структура грамадства. Эканамічная, сацыяльная, палітычная, сацыякультурная сістэмы як элементы грамадства ў цэлым. Сацыяльныя супольнасці і групы: этнас, клас, саслоўе, сям'я, сацыяльна-дэмаграфічныя, сацыяльна-прафесійныя групы, тэрытарыяльна-пасяленская супольнасць. Сацыяльныя супольнасці як крыніца сацыяльных рухаў, змен і працэсаў.

Тыпалогія грамадстваў. Асноўныя падыходы да вылучэння пэўных тыпаў грамадства. Асновы тыпалагізацыі.

Грамадства і дзяржава. Эвалюцыя грамадства. Сацыяльны прагрэс. Формы прагрэсу.

## Тэма 3. Сацыяльная структура і стратыфікацыя: праблемы сацыяльнай няроўнасці

Сацыяльная дыферэнцыяцыя чалавечага грамадства – аб'ектыўны працэс сацыяльна-гістарычнага развіцця. Механізм стварэння і функцыянавання сацыяльных груп. Сацыяльная структура грамадства: паняцце і асноўныя элементы – класы, слаі, прафесійна-галіновы, сацыяльна-тэрытарыяльны, сацыяльна-этнічны і інш. Сацыяльныя супольнасці. Сацыяльныя групы. Тыпы сацыяльных супольнасцей.

Сацыяльная структура (гарызантальны зрэз грамадства) і сацыяльная стратыфікацыя (вертыкальны зрэз), прычыны іх узнікнення. Тэорыі сацыяльнай структуры і сацыяльнай стратыфікацыі (К. Маркс, М. Вебер, П. Сарокін, Э. Гідэнс і інш.), іх асноўныя адрозненні.

Няроўнасць як крытэрый стратыфікацыі. Асноўныя вымярэнні стратыфікацыі: улада, даход, адукацыя і інш. Гістарычныя сістэмы сацыяльнай стратыфікацыі: рабства, касты, саслоўі, класы. Паняцці «сацыяльны клас», «сацыяльная група», «сацыяльны слой» (страта), «сацыяльны статус». Разнастайнасць мадэлей стратыфікацыі. Сацыяльная мабільнасць.

Сацыяльная структура сучаснага беларускага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прынцыпы стратыфікацыі, асноўныя сацыяльныя групы ў дынаміцы і роля кожнай групы ў развіцці беларускага грамадства. Праблема сярэдняга і «прадпрымальніцкага» класа ў сучасным постсавецкім грамадстве. Маргіналы.

Узнікненне вучэнняў аб класах у мысліцеляў эпохі Рэстаўрацыі. Марксісцкае вучэнне аб класах. Тэорыі сацыяльнай дыферэнцыяцыі М. Вебера, Т. Парсанса. Дыялектыка сацыяльнай інтэграцыі і дыферэнцыяцыі. Асаблівасці ўнутрыкласавай дыферэнцыяцыі.

Сацыяльныя інстытуты. Сацыяльныя арганізацыі.

Аб'ектыўная неабходнасць рэгулявання сацыяльных сувязей і працэсаў, якая забяспечвае задавальненне найбольш важных індывідуальных і калектыўных патрэбнасцей, таму што чалавек мноствам нябачных ніцей звязаны з іншымі людзьмі і грамадствам у цэлым.

Паняцце сацыяльнага інстытута. Сацыяльны інстытут як устойлівы комплекс фармальных і нефармальных норм, правіл, прынцыпаў, якія рэгулююць розныя сферы чалавечай жыццядзейнасці і арганізуюць іх у сістэму сацыяльных статусаў і сацыяльных роляў.

Тыпалогія сацыяльных інстытутаў. Інстытуты фармальныя і нефармальныя, якія характарызуюць спосаб рэгламентацыі іх дзейнасці. Характарыстыка сацыяльных інстытутаў у залежнасці ад зместу і накіраванасці дзейнасці. Інстытуты эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя, сацыякультурныя, рэлігійныя, спартыўныя. Іншыя падыходы да тыпалогіі інстытутаў. Тыпы інстытутаў па іх сацыяльна-функцыянальнай ролі. Інстытуты, якія рэгулююць рэпрадуктыўныя паводзіны (сям'я, сямейна-роднасныя сувязі). Інстытуты адукацыі, выхавання, вытворчасці. Інстытуты, якія забяспечваюць захаванне арганізацыі грамадства (палітыка, улада).

Функцыі сацыяльных інстытутаў: замацаванне і ўзнаўленне грамадскіх адносін, рэгулятыўная, інтэгратыўная, трансліруючая, камунікатыўная.

Паняцце сацыяльнай арганізацыі як групы людзей, што складаюць частку грамадства, арыентаваных на дасягненне ўзаемазвязаных спецыфічных мэт і фарміраванне высокафармалізаванай структуры. Тыпалогія, мэты, пабудова, функцыянаванне арганізацый. Спецыфіка функцыянавання сацыяльных інстытутаў і сацыяльных арганізацый у Рэспубліцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Сацыядынаміка грамадства і культуры: развіццё, прагрэс, крызіс

Вызначэнне сацыяльнага працэсу. Працэс як паслядоўная змена стану або перамяшчэнне элементаў сацыяльнай сістэмы і яе падсістэм, любога сацыяльнага аб'екта.

Праблема інтэрпрэтацыі гістарычнага працэсу: мадэлі сацыядынамікі грамадскага развіцця. Сацыялагічныя школы аб развіцці грамадства і культуры.

Паняцце сацыяльнага развіцця. Развіццё і прагрэс: агульнае і асаблівае. Крытэрыі сацыяльнага прагрэсу. Супярэчнасці ў развіцці грамадства. Асоба і грамадства перад выклікамі сучаснасці.

Крызіс як стадыя развіцця сацыяльных сістэм. Паняцце дысфункцыі (Р. Мертон). Прыкметы крызісу. Тыпалогія крызісу (сістэмны, структурны, функцыянальны і інш.). Пераадоленне крызісу.

Асаблівасці сацыяльнага кіравання і змест сацыяльнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Структура і змест сацыяльнай палітыкі ў розных сферах жыццядзейнасці грамадства. Сацыяльная палітыка ў прафілактыцы сацыяльных паталогій грамадства: беспрацоўя, міграцыі; дапамога і сацыяльнае забеспячэнне асоб пажылога і састарэлага ўзростаў, моладзі, сям'і, дзяцей. Сацыяльная палітыка ў прафілактыцы сацыяльных паталогій і дэвіяцый (бяздомнасці і жабрацтва, алкагалізму і прастытуцыі, наркаманіі, суіцыду і да т. п.).

Мадэль устойлівага развіцця беларускага грамадства.

Культура як сістэма каштоўнасцей і норм (культура і грамадства).

Культура як сацыяльная сістэма. Вызначэнне і асноўныя падыходы да вывучэння культуры. Культура як складаны дынамічны феномен, які мае сацыяльную прыроду і адлюстроўвае сацыяльныя адносіны, накіраваныя на стварэнне, захаванне, размеркаванне, перадачу і выкарыстанне матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Сутнасць, формы праяўлення, асноўныя катэгорыі культуры. Спецыялізаваныя падсістэмы культуры.

Сацыяльныя функцыі культуры: пазнавальная, матывацыйная, нарматыўная, аксіялагічная, эўрыстычная, інтэграцыйная, рэкрэацыйная і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стан і функцыянаванне сацыяльных інстытутаў і ўстаноў у сферы вытворчасці і спажывання культуры. Стан і дзейнасць кадраў культуры.

Дынаміка культуры ў рамках сацыяльнай структуры грамадства.

Роля культуры ў жыццядзейнасці асобы. Механізм засваення і вытворчасці культуры асобай. Змяненне сацыяльнага статусу індывіда ў залежнасці ад узроўню культуры.

Месца і роля работніка культуры ў грамадстве ў сучасны перыяд. Забеспячэнне кадрамі культуры. Сістэма падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў у рэспубліцы.

Асоба як сістэма. Чалавек: прырода і сацыякультурная сутнасць. Вызначэнне і ўзаемасувязь паняццяў «чалавек», «індывід», «індывідуальнасць», «асоба». Чалавек як біялагічная і сацыякультурная істота, у якой біялагічнае, сацыяльнае, культурнае знаходзяцца ў непарыўным адзінстве.

Сацыяльная сутнасць асобы.

Асоба – чалавек (індывід), які валодае адносна ўстойлівай і цэласнай сістэмай сацыяльна значных і індывідуальна выражаных якасцей, набытых і развіваемых ім у працэсе ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі. Сістэма сацыяльна значных і індывідуальных якасцей як прадукт грамадскага развіцця.

Структура асобы. Свядомасць асобы. Патрэбнасці і інтарэсы. Матывы, мэты дзейнасці, здольнасці, сацыяльныя чаканні, запатрабаванні асобы. Устаноўкі і каштоўнасныя арыентацыі асобы.

Тыпалогія асобы. Прынцыпы і падыходы да тыпалагізацыі асобы: гістарычны, фармацыйны, класава-стратыфікацыйны, прафесійны і інш. Базісныя характарыстыкі асобы; мадальная, базісная, маргінальная асоба. Ідэальны тып асобы.

Статусная і ролевая канцэпцыі асобы. Паняцце сацыяльнага статусу асобы. Характарыстыка сацыяльнага стану асобы або сацыяльнай групы ў адпаведнасці з прафесіяй, сацыяльна-эканамічным становішчам, полам, паходжаннем, сямейным становішчам. Характарыстыка статусаў асобы. Статусы прадпісаныя і набытыя. Сацыяльная роля асобы. Мноства роляў, выконваемых кожнай асобай. Ролевыя сістэмы. Ролевыя канфлікты.

Асоба і грамадства. Грамадства як сацыяльнае ўзаемадзеянне асоб і сацыяльных груп. Асоба і сацыяльная стратыфікацыя. Шматгранныя сувязі асобы з сацыякультур-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным асяроддзем.

Сацыялізацыя і сацыяльная адаптацыя асобы. Этапы сацыялізацыі асобы. Сацыялізацыя як працэс і адначасова вынік. Сацыяльная адаптацыя і інтэграцыя асобы. Сацыялізацыя і індывідуалізацыя асобы. Рэсацыялізацыя і дэсацыялізацыя.

## Тэма 5. Сям'я як сацыяльны інстытут і сацыяльная група. Сацыяльна-дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі

Вызначэнне паняццяў «сям'я» і «шлюб». Сям'я як сацыяльны інстытут і як малая сацыяльная група. Сувязь сям'і з іншымі сацыяльнымі супольнасцямі, інстытутамі, сферамі грамадскага жыцця.

Узнікненне і генезіс сям'і і шлюбу.

Функцыі сям'і на сучасным этапе сацыяльнага развіцця грамадства як сацыяльнага інстытута і сацыяльнай групы.

Гістарычныя тыпы і формы сямейна-шлюбных адносін, тэндэнцыі і перспектывы іх развіцця. Аналіз праблемы развіцця інстытута сям'і і шлюбу праз прызму іншых грамадскіх сацыяльна-эканамічных, палітычных і духоўных структур грамадства.

Сям'я як механізм пераемнасці культурных і сацыяльных форм і інстытутаў. Сучасная сям'я: спецыфіка, тэндэнцыі, праблемы функцыянавання.

Асаблівасці сямейна-шлюбных адносін у Рэспубліцы Беларусь. Пол і гендар. Гендарныя даследаванні ў сучаснай сацыялогіі.

Агульныя сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі насельніцтва зямлі.

Сацыяльна-дэмаграфічная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь і шляхі яе паляпшэння.

## Тэма 6. Магчымасці эмпірычнага сацыялагічнага даследавання грамадства

Паняцце і сутнасць сацыялагічнага даследавання як сістэмы паслядоўных метадалагічных і арганізацыйна-тэхнічных працэдур атрымання дакладных даных аб вывучаемай сацыялагічнай з'яве ці працэсе з мэтай прырашчэння навуковых ведаў або рашэння канкрэтных сацыяльных задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фундаментальныя і прыкладныя сацыялагічныя даследаванні. Асноўныя віды сацыялагічных даследаванняў: разведвальнае, апісальнае, аналітычнае. Разавае і паўторнае даследаванні, аператыўнае даследаванне.

Асноўныя этапы сацыялагічнага даследавання.

Праграма сацыялагічнага даследавання. Паняцце праграмы сацыялагічнага даследавання, яе асноўныя элементы. Тэарэтычна-метадалагічны раздзел. Фармуліроўка праблемы даследавання. Аб'ект і прадмет сацыялагічнага даследавання. Эмпірычная інтэрпрэтацыя паняццяў. Вызначэнне мэты даследавання як шляху рэалізацыі праблемы. Задачы сацыялагічнага даследавання. Тыпы задач: асноўныя і неасноўныя, тэарэтычныя і эмпірычныя, фундаментальныя і прыкладныя. Гіпотэза ў сацыялагічным даследаванні.

Методыка-працэдурны раздзел праграмы. Выбарка ў сацыялагічным даследаванні. Характарыстыка рабочага плана даследавання.

Метады збору сацыялагічнай інфармацыі. Паняцце метаду. Назіранне ў сацыялогіі: паняцце, агульная характарыстыка, асаблівасці, класіфікацыя, аб'ект, прадмет і ўмовы, этапы і працэдура, рэгістрацыя вынікаў і спецыфіка іх апрацоўкі. Праблема надзейнасці і дакладнасці вынікаў.

Метад аналізу дакументаў. Дакументы – важная крыніца сацыялагічнай інфармацыі. Класіфікацыя дакументаў у сацыялогіі. Характарыстыка дакументаў.

Апытанне ў сацыялагічным даследаванні: агульная характарыстыка, яго віды, вартасць і недахопы. Асноўныя віды апытанняў: анкетаванне і інтэрв'ю. Тэхніка складання дакументаў для апытання, іх абумоўленасць праграмай даследавання.

Метады і тэхніка экспертных ацэнак.

Эксперымент у сацыялогіі: сутнасць, класіфікацыя.

Апрацоўка і аналіз сацыялагічнай інфармацыі. Падрыхтоўка пярвічнай сацыялагічнай інфармацыі для апрацоўкі і аналізу. Рэдагаванне і кадзіраванне даных. Кантроль даных і выпраўленне памылак. Стварэнне пераменных індэксаў.

Этапы арганізацыі працэсу аналізу эмпірычных даных сацыялагічнага даследавання: апісанне, тлумачэнне, прадбачанне.

Справаздача аб выніках даследавання. Навукова абгрунтаваныя рэкамендацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго аўд. гадзін | лекцыі | семінары |
| *Тэма 1.* Уводзіны. Сацыялогія як навука і вучэбная дысцыпліна | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 2.* Сістэмныя характарыстыкі грамадства як формы арганізацыі сацыяльных адносін | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Сацыяльная структура і стратыфікацыя: праблемы сацыяльнай няроўнасці | 2 | 2 | |
| *Тэма 4.* Сацыядынаміка грамадства і культуры: развіццё, прагрэс, крызіс | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Сям'я як сацыяльны інстытут і сацыяльная група. Сацыяльна-дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Магчымасці эмпірычнага сацыялагічнага даследавання грамадства | 2 | 2 | |
| **Разам…** | **18** | **12** | **6** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


1. *Бабосов, Е. М.* Социология : учебник / Е. М. Бабосов. – Минск : ТетраСистемс, 2011. – 288 с.

2. *Бабосов, Е. М.* Прикладная социология : учеб. пособие для вузов / Е. М. Бабосов. – Минск : ТетраСистемс, 2000. – 493 с.

3. *Бабосов, Е. М.* Социология. Общая социологическая теория : учеб. пособие для вузов / Е. М. Бабосов. – Минск : Дизайн ПРО, 1998. – 383 с.

4. *Волков, Ю. Г.* Социология будущего: социологическое знание и социальный проект : моногр. / Ю. Г. Волков. – М. : КНОРУС, 2017. – 178 с.

5. *Гидденс, Э.* Социология : учебник : пер. с англ. / Э. Гидденс. – М. : Эдиториал УРСС, 1999. – 703 с.

6. *Данилов, А. Н.* Социология : учеб. пособие / А. Н. Данилов. – Минск : БГУ, 2012. – 384 с.

7. *Елсуков, А. Н.* История социологии / А. Н. Елсуков, А. Н. Данилов. – Минск : Книжный дом, 2012. – 576 с.

8. История социологии : учебник : в 3 кн. / под общ. ред. В. И. Добренькова. – М. : Инфра-М, 2004. – 592 с.

9. *Ігнатовіч, П. Р.* Сацыялогія : вучэб.-метад. дапам. / П. Р. Ігнатовіч. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 226 с.

10. *Лапин, Н. И.* Общая социология : учеб. пособие для вузов / Н. И. Лапин. – М. : Высш. шк., 2009. – 451, [1] с.

11. *Мкртчян, Е. Р.* Основы социологии : учеб. пособие / Е. Р. Мкртчян ; Волгоградский ин-т управления – филиал ФГБОУ ВО РАНХиГС. – Волгоград : Изд-во Волгоградского ин-та управления – филиала РАНХиГС, 2017. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – Систем. требования: IBM PC с процессором 486; ОЗУ 64 Мб; CD-ROM дисковод; Adobe Reader 6.0. – Загл. с экрана.

12. Оперативные социологические исследования: методика и опыт организации / под ред. Д. Г. Ротмана. – Минск : Белорус. гос. ун-т, 2001. – 353, [1] с.

13. *Смелзер, Н.* Социология : учеб. пособие для студентов вузов : пер. с англ. / Н. Смелзер. – М. : Феникс, 1994. – 687 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14.* Социология : курс лекций / Ю. Г. Волков [и др.]. – Ростов н/Д : Феникс, 2000. – 511 с.

*15.* Социология : учеб. пособие для вузов / под общ. ред. А. Н. Елсукова. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 542 с.

*16.* Социология : учебник / В. И. Добреньков, А. И. Кравченко. – М. : НИЦ ИНФРА-М, 2017. – 624 с.

*17. Тощенко, Ж. Т.* Социология : учебник для студентов вузов / Ж. Т. Тощенко. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : ЮНИТИ-ДАНА, 2005. – 640 с.

*18. Фролов, С.С.* Социология : учебник / С. С. Фролов. – М. : Логос, 1996. – 359 с.

*19. Ядов, В. А.* Стратегия социологического исследования. Описание, объяснение, понимание социальной реальности / В. А. Ядов. – М. : Добросвет : Кн. дом «Университет», 2003. – 595, [1] с.

*Дадатковая*

*1. Бабосов, Е. М.* Социология личности, стратификации и управления / Е. М. Бабосов. – Минск : Белорус. наука, 2006. – 590, [1] с.

*2. Бабосов, Е. М.* Социология управления: учеб. пособие для вузов / Е. М. Бабосов. – Минск : ТетраСистемс, 2002. – 287 с.

*3. Баразгова, Е. С.* Американская социология: традиции и современность: курс лекций / Е. С. Баразгова. – Екатеринбург : Деловая кн. ; Бишкек : Одиссей, 1997. – 173, [2] с.

*4. Бауман, З.* Мыслить социологически: пер. с англ. / З. Бауман. – М. : Аспект Пресс, 1996. – 255 с.

*5. Ерасов, Б. С.* Социальная культурология / Б. С. Ерасов. – М. : Аспект Пресс, 1996. – 591 с.

*6. Игнатович, П. Г.* Развитие социологии в Беларуси / П. Г. Игнатович // Социология. – 1998. – № 1. – С. 48–56.

*7.* История социологии: учеб. пособие для вузов / под общ. ред. А. Н. Елсукова. – Минск : Выш. шк., 1997. – 380, [1] с.

*8. Ионин, Л. Г.* Социология культуры : учеб. пособие / Л. Г. Ионин. – М. : Логос, 1996. – 278 с.

*9.* Краткий словарь по социологии / А. С. Айзикович [и др.]. – М. : Политиздат, 1988. – 477, [2] с.

*10. Лапина, С. В.* Социология : курс лекций. В 2 ч. Ч. 1 / С. В. Лапина. – Минск : Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2004. – 140 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*11. Ленин, В. И.* Великий почин / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : в 55 т. – 5-е изд. – М., 1970. – Т. 39. – С. 1–29.
*12. Мальченков, Е. И.* Социология : учеб. пособие / Е. И. Мальченков. – Витебск : ВГТУ, 2004. – 182 с.
*13. Моль, А.* Социодинамика культуры : пер. с фр. / А. Моль. – М. : Прогресс, 1973. – 405, [1] с.
*14. Подгайская, Л. И.* Социология : учеб.-метод. комплекс / Л. И. Подгайская. – Минск : Мисанта, 2006. – 111 с.
*15. Симхович, В. А.* Социология : учеб. пособие / В. А. Симхович. – Минск : БГЭУ, 2006. – 199 с.
*16.* Словарь прикладной социологии / сост. К. В. Шульга. – Минск : Университетское, 1984. – 317 с.
*17.* Социологический словарь / сост.: А. Н. Елсуков, К. В. Шульга. – Минск : Университетское, 1991. – 528 с.
*18.* Социология: Основы общей теории : учеб. пособие / Г. В. Осипов, Л. Н. Москвичев, А. В. Кабыща [и др.] ; под ред. Г. В. Осипова, Л. Н. Москвичева. – М. : Аспект Пресс, 1996. – 461 с.
*19.* Социология : курс лекций : учеб. пособие / под ред. А. В. Миронова, В. В. Панферовой, В. М. Утенкова. – М. : Соц.-полит. журн., 1996. – 256 с.
*20.* Социология: наука об обществе: учеб. пособие для вузов / под ред. В. П. Андрущенко, Н. И. Горлача. – Харьков : ИМП «Рубикон», 1996. – 686 с.
*21*. Социологическая энциклопедия / под общ. ред. А. Н. Данилова. – Минск : Беларус. энцыкл., 2003. – 380, [2] с.
*22. Тощенко, Ж. Т.* Социология: Общий курс : учеб. пособие для вузов / Ж. Т. Тощенко. – М. : Прометей, 1994. – 383 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метады і тэхналогіі навучання

Асноўнымі метадамі і тэхналогіямі навучання з’яўляюцца:

1. Метады праблемнага навучання (праблемнае выкладанне, пошукавы і даследчы метады);

2. Асобасна арыентаваныя (развіваючыя) тэхналогіі, заснаваныя на актыўных (рэфлексійна-дзейнасных) формах і метадах навучання (мазгавы штурм, дзелавая, ролевая і імітацыйная гульні, дыскусія, прэс-канферэнцыя, навучальныя дэбаты, круглы стол, кейс-тэхналогія, праект і інш.);

3. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, якія забяспечваюць праблемна-даследчы характар працэсу навучання і актывізацыю самастойнай работы студэнтаў (структураваныя электронныя прэзентацыі для лекцыйных заняткаў, выкарыстанне аўдыя-, відэападтрымкі вучэбных заняткаў (аналіз аўдыя-, відэасітуацый і інш.).

Па кожнай тэме праектуюцца і рэалізуюцца розныя педагагічныя тэхналогіі. Сярод іх: варыятыўныя мадэлі самастойнай працы студэнтаў, блочна-модульныя, модульна-рэйтынгавыя і крэдытныя сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, метад кейсаў, методыкі актыўнага навучання.

## Самастойная работа студэнтаў

Мэта самастойнай работы студэнтаў – павышэнне канкурэнтаздольнасці выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі з дапамогай фарміравання ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

## Сродкі дыягностыкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Задачы дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў:

– вызначэнне аб’екта дыягностыкі;

– выяўленне факта вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай тэстаў і іншых сродкаў дыягностыкі;

– вымярэнне ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту;

– ацэньванне вынікаў вымярэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай шкалы ацэнак.

Для дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый студэнтаў могуць выкарыстоўвацца наступныя асноўныя формы і сродкі:

– комплексныя заданні па сацыялогіі;

– тэст;

– кантрольныя работы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– эсэ;
– ацэнка на аснове праектнага метаду;
– ацэнка на аснове вучэбнай гульні;
– справаздачы па вучэбна-даследчай працы студэнтаў;
– самаацэнка кампетэнцый студэнтамі (ліст самаацэнкі);
– рэферат;
– залік;
– экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**САЦЫЯЛОГІЯ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2019. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,76. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ